ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

'90 ЧАЦВЕР 22 ЛІСТАПАДА № 31 (1660)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ЧЫРВОНЫ РАДОК

**Справаздачна-выбарныя камсамольскія канферэнцыі следам за ФПМ адбыліся на юрфаку, філфаку і ў біёлагаў.**

**На біялагічным факультэце, як і на ФПМ, канферэнцыя больш нагадвала пашыранае пасяджэнне факультэцкага камітэта камсамола — па колькасці і саставу. Рашэнне прынялі толькі па адным пытанні. Усе камсамольцы факультэта хутка атрымаюць свае карткі ўліку і на працягу месяца павінны будуць вырашыць: пакінуць іх назаўсёды ў сябе, на памяць, ці ўсё ж такі не развітвацца з камсамолам.**

**Будучы месяц можа прынесці і іншыя змены біяфаку. Але пра гэта — пазней...**

## Партнёры ў Амерыцы



ПА САКРЭТУ УНІВЕРСІТЭТУ

З 15 да 18 лістапада БДУ наведалі госці са Злучаных Штатаў Амерыкі: Прэзідэнт Каліфарнійскага дзяржаўнага універсітэта (г. Фрэсна) доктар Гаральд Х. Хаак і яго намеснік па міжнародных сувязях.

Яны наведалі НДІ ядзерных праблем, пазнаёміліся з гістарычнымі мясцінамі Мінска, былі гледачамі балета «Рамэо і Джульета» ў Дзяржаўным Акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета БССР.

Галоўным вынікам візіту амерыканцаў у наш універсітэт стала абмеркаванне і падпісанне пагаднення і плана супрацоўніцтва на 1991-92 гг. паміж Каліфарнійскім універсітэтам г. Фрэсна і Беларускім дзяржаўным універсітэтам імя У. І. Леніна. Гэтымі дакументамі прадугледжваецца ўзаемавыгадны абмен прафесарамі, выкладчыкамі і студэнтамі, навуковай інфармацыяй і друкаванымі працамі, вопытам арганізацыі вучэбна-метадычнай і выхаваўчай работы на факультэтах і кафедрах, правядзенне сумесных навуковых даследаванняў і семінараў, чытанне лекцый на безвалютнай аснове.

Якія надзеі ўскладае на падпісаныя дакументы доктар Г. Х. Хаак? Чытайце 3-ю старонку.

НЕ ВЕРЫЦЕ?

## Усе мы з комплексам...

Ці мог Дэмасфен быць дрэнным прамоўцай? Зразумела, не! Бо, маючы моўны дэфект, ён імкнуўся пераадолець яго і — такім чынам дасягнуў прамоўніцкіх вышыняў. Калі выказацца больш навукова — гэта прыклад кампенсацыі арганічнай непаўнацэннасці. А прасцей — комплекса непаўнацэннасці. Філосаф, у тэорыі якога гэта паняцце займала асноўнае месца,— Альфрэд Адлер. Яму была прысвечана чарговая лекцыя, прачытаная спецыяльна для нашага універсітэта кандыдатам філасофскіх навук з Ленінграда Сяргеем Мацвеевічам **ЧАРКАСАВЫМ.**

Што б сказалі тыя, хто не любіць людзей «з комплексамі», даведаўшыся: чалавецтва нарадзілася як вынік непаўнацэннасці тупіковай галіны прыматаў? Больш таго, быць чалавекам — значыць, па Адлеру, валодаць комплексам непаўнацэннасці, які прабіваецца да ўласнай перамогі. Філосаф расцэньваў усе чалавечыя поспехі і дасягненні як вынік барацьбы з комплексам непаўнацэннасці. І бачыў выйсце для кожнай асобы ў трох галоўных мэтах жыцця: творчай дзейнасці, адданым сяброўстве і шчырым каханні.

У першай сваёй лекцыі, прысвечанай Фрэйду, С. М. Чаркасаў быў прыхільнікам яго тэорыі, у другой — стаў «адлер'янцам». І збіраецца працягваць такую гульню-ператварэнне ў кожнай з трох лекцый, якія яшчэ правядзе для універсітэцкай аўдыторыі.

27 лістапада Сяргей Мацвеевіч Чаркасаў зноў наведае БДУ. Каб папулярна пераказаць чарговую складаную тэорыю, ілюструючы яе самымі жыццёвымі прыкладамі, даць слухачам разумныя практычныя парады і самыя нечаканыя адказы на іх пытанні.

## Кветкі сярод кветак

Выстаўка пад такой назвай будзе адкрыта да 4 снежня ў Палацы мастацтваў (вул. Казлова, 3).

Па зале ходзяць у асноўным мужчыны. Аўтар выстаўкі таксама мужчына — літоўскі майстар мастацкай фатаграфіі Рымантас Дыхавічус. І ўсё ж жанчын экспазіцыя з яго здымкаў павінна зацікавіць не менш, бо Прыгажосць не дзеліць людзей па прыметах полу.

У кнізе водгукаў адзін наведвальнік адзначыў уменне Р. Дыхавічуса зарабляць грошы, другі напісаў: «Вашы сапраўдныя кветкі лепшыя, чым кветкі-жанчыны...»

Магчыма, пакідаючы выстаўку, яны знайшлі адказ у словах, якія даслаў ёй аўтар: «...праз Кветкі — да Прыгажосці, праз Прыгажосць — да Кахання, праз Каханне — да Ісціны, праз Ісціну — да Волі, праз Волю — да Творчасці, праз Творчасць — да Бога!».

ПА СЛЯДАХ ПАДЗЕІ

## ПРЭЗІДЭНТ ПРЫНЯЎ ЗВАРОТ

Сустрэча М. С. Гарбачова са студэнтамі, якая адбылася 1 лістапада, зафіксавана не толькі сродкамі масавай інфармацыі. Яшчэ адно дакументальнае сведчанне яе — Зварот да Прэзідэнта, які склалі і перадалі яму прадстаўнікі студэнцкіх калектываў ВНУ краіны, Асацыяцыі прафсаюзных арганізацый студэнтаў ВНУ СССР і дэлегаты ад студэнтаў на XIX з'езд прафсаюзаў СССР.

У напісанні Звароту ўдзельнічаў і прадстаўнік БДУ — старшыня прафбюро хімічнага факультэта Павел БЫЧКОЎСКІ. Ён перадаў яго ў газету «Беларускі універсітэт».

Аўтары Звароту лічаць, што для стабілізацыі складанага становішча, якое склалася сёння ў студэнцкім асяроддзі, Прэзідэнту і ўраду СССР неабходна тэрмінова вырашыць мноства праблем. Напрыклад, прадугледзець пры фарміраванні дзяржаўнага бюджэту выдзяленне сродкаў на народную адукацыю памерам 10 працэнтаў ад нацыянальнага даходу, павысіць стыпендыю да афіцыйнага пражытачнага мінімуму з улікам раённых каэфіцыентаў; ажыццявіць праз сістэму Дзяржаўнага заказу прыярытэтнае будаўніцтва аб'ектаў народнай адукацыі; забяспечыць рацыянальны мінімум харчавання студэнтам і навучэнцам па дзяржаўных цэнах.

Удзельнікі сустрэчы з Прэзідэнтам лічаць абавязкам улад вырашэнне і такіх праблем, як захаванне існуючай структуры медыцынскага абслугоўвання студэнтаў і навучэнцаў пры пераходзе органаў аховы здароўя на новыя метады гаспадарання і забарону ўвядзення ў студэнцкіх паліклініках, бальніцах і медпунктах платных паслуг: стварэнне Студэнцкага фонду за кошт Дзяржаўнага фінансавання і паступленняў ад іншых зацікаўленых арганізацый.

СКАРБОНКА ПАРАД

## Не хадзіце далёка

ЧАКАЕМЫ ПРАГНОЗ: **у наступным годзе залы бібліятэк будуць запаўняцца больш інтэнсіўна, чым раней, зразумела, у сувязі з падаражаннем газет і часопісаў. МАГЧЫМАЕ ВЫРАТАВАННЕ для супрацоўнікаў, выкладчыкаў і студэнтаў БДУ бачыцца ў больш частым звароце ў чытальныя залы «роднай» бібліятэкі.**

Колькасць перыёдыкі, якая будзе з'яўляцца тут з новага года, не зменшылася. Акрамя замежных выданняў: калі раней нам дасылалася 136 часопісаў і 3 газеты замежных краін, то з 1991 года застанецца толькі 30 часопісаў — усё астатняе знікла з падпісных каталогаў.

У сувязі з тым, што савецкія выданні падаражалі ў сярэднім у 3 разы, трэба было знайсці спосаб не перавысіць значна суму мінулагодняй падпіскі, якая складала прыкладна 26 тысяч рублёў. Для гэтага пазбавілі падпіскі партком і камітэт камсамола універсітэта, а таксама абмежавалі ўсе грамадска-палітычныя кафедры, што размешчаны ў хімічным корпусе, агульнымі экземплярамі неабходных ім выданняў. Дзякуючы гэтым крокам, кошт падпіскі на 1991 года не перавышае 37 тысяч рублёў.

З новага года чытальныя залы нашай бібліятэкі прапануюць усе новыя выданні, якія з'явіліся ў рэспубліцы. А таксама — «Московские новости» на рускай мове (упершыню), дадатак да «Советской культуры» штотыднёвік «Экран и сцена», газету «Мегаполис-экспресс», часопіс «Мегаполис» і многія іншыя выданні, папулярныя сёння ў

НЕ АБМІНІЦЕ!

## Час — грошы

Звычайна мы выбіраемся сюды ў выхадны дзень, мяркуючы плённа папрацаваць. Але ўжо з першых хвілін разумеем: мала жадаць. Таму што жадаючых вельмі многа. І зноў папрокі на адрас работнікаў бібліятэкі, маўляў, працуеце марудна. Справядлівыя ці не зусім былі тыя выказванні, аднак расчулілі, відаць, сэрцы бібліятэкараў. З мэтай павышэння якасці абслугоўвання чытачоў у Дзяржаўнай бібліятэцы імя У. І. Леніна арганізавана служба прыёму заказаў літаратуры па тэлефону.

Дык вось, унёсшы пэўную плату (20 капеек за адзін выкананы заказ, вы атрымаеце любое выданне з фондаў аддзела кнігасховішча. Звярнуц-

за выключэннем суботы і нядзелі (у святочныя і санітарныя дні бібліятэка не працуе) і праз тры гадзіны вы атрымаеце неабходную для работы літаратуру. Такая форма абслугоўвання чытачоў вельмі зручная. Напрыклад, збіраючыся ў бібліятэку, вы можаце заказаць кнігі яшчэ дома і калі прыйдзеце сюды, заказ ужо будзе чакаць вас.

**Напамінаем, абслугоўванне платнае. Унесці грошы вы зможаце ў рэгістратуры галоўнага корпуса бібліятэкі імя У. І. Леніна (у панядзелак, аўторак і сераду — з 14 да 20, а ў чацвер і пятніцу — з 10 да 12 і з 13 да 17 гадзін).**

**ПАВЕДАМЛЯЕМ ТЭЛЕФОН ДЛЯ ЗАЯВАК:**

КРЫМІНАЛЬНАЯ ХРОНІКА

## Замах на жыццё камітэта



Забойцы пралічыліся: сцяна рухнула ўначы, калі ў камітэце камсамола БДУ ніхто не дзяжурыў.

Аператыўная група, якая выехала на месца, паведамляе: ад сцяны засталося яшчэ некалькі ладных кавалкаў тынкоўкі. Ёсць меркаванне, што разлік злачынцаў рабіўся на тое, каб папярэдзіць ахвяр: для пачатку ўвесь цяжар абваліўся на адно крэсла, якое зламалася. Хто наступны? Ці вытрымае ён усю тынкоўку, што засталася на той злашчаснай сцяне? Каля яе больш не стаяць ні крэслы, ні сталы, ні камсамольцы. Але ж колькі яшчэ такіх сцен у спарахнелых будынках універсітэта...

Фота С. ГРЫЦА

Нават у той найскладанейшай, часам непрадказуемай і некіруемай сітуацыі, у якой мы з вамі апынуліся сёння, ёсць свае ўнутраныя заканамернасці. Не зразумеўшы іх, не выйсці нашаму грамадству з крызісу. Таму цяпер, як, магчыма, ніколі раней, узрастае роля сацыялогіі — з яе шырокай апеляцыяй да грамадскай думкі і строгімі лічбавымі данымі.

Сённяшняя наша гутарка — з дэканам філасофска-эканамічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна, загадчыкам кафедры сацыялогіі, доктарам філасофскіх навук, прафесарам **Альбертам Мікалаевічам ЕЛСУКОВЫМ.**

# Я НЕ ХАЦЕЎ БЫ БЫЦЬ ЗЛЫМ ПРАРОКАМ

— Развіцце сацыялогіі ў нашай краіне доўгі час штучна стрымлівалася. Пэўныя зрухі намеціліся толькі ў апошнія гады, хаця і сёння нам даволі далёка да славутых інстытута Гелапа ці службы Харыса. Між тым, сітуацыя ў нашым грамадстве змяняецца так імкліва. Альберт Мікалаевіч, як Вы ўяўляеце сабе перспектывы сацыялогіі ў перыяд пераходу да рыначнай эканомікі?

— Чым далей будуць развівацца рыначныя адносіны, тым усё больш будзе адчувацца неабходнасць сацыялогіі ў сапраўдным сэнсе, а не як павеваў моды. Бо сацыялагічная інфармацыя карысная для дзелавых людзей. Узяць хаця б рыначны попыт. Прадпрымальнік гатовы заплаціць добрыя грошы за апературыўную, аб'ектыўную інфармацыю, бо без яе вытворчасць проста не здольна стаць прыбытковай.

Спадзяюся, увядзенне рыначных адносін толькі ўзмоцніць пазіцыі сацыялогіі ў нашым грамадстве.

— Так што адкрыццё два гады назад у Белдзяржуніверсітэце філасофска-эканамічнага факультэта і стварэнне на ім аддзялення сацыялогіі з'явілася надзвычай своечасовым. Якая спецыфіка навучання будучых сацыёлагаў? Дзе будуць працаваць падрыхтаваныя Вамі спецыялісты?

— Перш за ўсё, хачу сказаць, што хаця ў нашай кафедры сацыялогіі яшчэ дзіцячы ўзрост, базіруемся мы не на пустым месцы. Традыцыі сацыялагічных даследаванняў у Беларусі ёсць. Закладзены яны гадоў дзесяць назад на кафедры філасофіі БДУ, кіраваў якой у той час прафесар Георгій Пятровіч Давыдзюк. Ужо тады мы рыхтавалі невялікую групу сацыёлагаў, хаця ў дыпломах спецыяльна пра гэта не пісалася.

У першы ж год, як адкрылася аддзяленне сацыялогіі, на яго быў надзвычай высокі конкурс — амаль як на юрфак, самы папулярны факультэт у БДУ. Сёлета — таксама. Набор — 25 чалавек. Так што выбраць лепшых з лепшых нам няпроста.

Спецыфіка навучання вызначаецца спецыфікай самой сацыялогіі. Яна як ніводная іншая грамадская навука звязана з практыкай. А таму тэарэтычны курс літаральна з першага года пачынае спалучацца з практыкай. Нашы студэнты маюць шмат заказаў ад розных выдавецтваў, рэдакцый, сацыялагічных цэнтраў, і мы гэта заахвочваем.

Каго мы будзем выпускаць? Па-першае, выкладчыкаў ВНУ, бо сёння ўсё больш і больш навучальных устаноў імкнуцца ўвесці новы прадмет — сацыялогію. Другая частка студэнтаў будзе арыентавацца на навукова-даследчую работу і пойдзе, відаць, у Інстытут сацыялогіі АН БССР ці ў Цэнтр сацыялогіі пры БДУ. Трэцяя група — практычныя сацыёлагі. Яны накіруюцца на заводы, ва ўстановы, дзе ёсць штатныя адзінкі сацыёлагаў, і будуць даследаваць пытанні сацыяльнага развіцця калектыву, цякучасці кадраў, дысцыпліны і г. д. Гэтыя тры напрамкі вызначаюць і некаторыя асаблівасці ў падрыхтоўцы трох нашых сацыёлагаў.

— Некалькі гадоў назад мне давялося пазнаёміцца з дзейнасцю сацыёлагаў на прадпрыемствах аднаго з прамысловых гарадоў рэспублікі. Прызнаюся, няпэўнасць задач і неакрэсленасць вынікаў уразілі. Падумалася: ці не занадта вялікая раскоша ўтрымліваць штат людзей, ад якіх так мала карысці?

— Патрэбнасць у спецыяльных сацыялагічных даследаваннях даўно пачала адчувацца як на агульнадзяржаўным узроўні, так і на ўзроўні асобных прадпрыемстваў. Але як часта бывае ў нас, для вырашэння гэтага пытання не хапіла ні тэарэтычнай падрыхтаванасці, ні практычнай добрасумленнасці. Аддаючы даніну модзе, кіраўнікі прадпрыемстваў залічвалі на пасаду сацыёлагаў непрафесіяналаў — проста людзей з вышэйшай адукацыяй. І людзі ішлі, бо зарплата ім устанаўлівалася ўмерана - сярэдняя, адказнасці ж вялікай на іх не ўскладалася. Зразумела, ніякай методыкай сацыялагічных даследаванняў яны не валодалі. У выніку адбывалася элементарная дыскрэдытацыя самой сацыялогіі.

Але нават тады, калі на пасаду сацыёлагаў траплялі людзі з адпаведнай універсітэцкай падрыхтоўкай, вялікай аддачы ад іх не назіралася. Справа ў тым, што, як правіла, заказчык — адміністрацыя прадпрыемства — не быў зацікаўлены ў тым, каб атрымаць нейкія негатыўныя вывады. Разумееце? І таму вельмі часта самі вывады падганяліся пад тыя патрабаванні, якія выказваў заказчык. Вядома ж, яны страчвалі крытычную накіраванасць, аб'ектыўнасць. Калі сацыёлаг настойваў на праўдзівым адлюстраванні становішча рэчаў, яго проста звальнялі з прадпрыемства.

Нават у тых выпадках, калі сацыялагічныя даследаванні вяліся на аснове гаспадарчага дагавора, вынікі былі малаэфектыўныя. Прадпрыемства плаціла вялізныя грошы групе сацыёлагаў, якая працавала два, тры, часам чатыры гады. У рэшце рэшт атрымліваўся, так бы мовіць, умерана абцякальны матэрыял. Тыя рэкамендацыі, якія даваліся на яго падставе, нагадвалі рэзалюцыі партыйных ці прафсаюзных сходаў, і практычная аддача ад іх была не надта вялікая.

Усё гэта вызначалася сітуацыяй, у якой знаходзіліся і сацыялогія, і адміністрацыя прадпрыемстваў. Цяпер усе падобныя псеўдадаследаванні спынены. І калі сёння на прадпрыемстве захаваўся сацыёлаг, значыць і адміністрацыя разумее неабходнасць сапраўдных сацыялагічных даследаванняў, і ён сам здолеў даказаць гэта сваёй эфектыўнай работай.

— Што Вы разумееце пад словамі «сапраўдныя сацыялагічныя даследаванні»?

— Першае — аб'ектыўнасць даных. Для гэтага сацыёлаг павінен быць дапушчаны да шырокай, праўдзівай інфармацыі. Інакш ніколі не атрымаць прадукцыйных вынікаў.

Другое — добрасумленнасць самога даследчыка. Для гэтага ён у сваіх вывадах павінен зыходзіць не з сфармуляванай канцэпцыі, скажам, таго ж заказчыка, а выключна з атрыманых у ходзе работы звестак.

І апошняе — граматнасць, добрая метадалагічная падрыхтоўка сацыёлага, магчымасць шырока выкарыстоўваць сучасную тэхніку.

Вось пры гэтых умовах вынікі сацыялагічных даследаванняў змогуць дабратворна ўплываць на працэсы ў вытворчасці і грамадстве наогул.

— Ці звяртаецца на ваш факультэт па дапамогу ў сацыялагічных даследаваннях беларускі парламент?

— Абавязкова. Там зараз ствараецца сацыялагічная група, куды мы, вучоныя-сацыёлагі з універсітэта, уваходзім. Яе мэта — вывучаць працэсы, якія адбываюцца ў самім Вярхоўным Савеце, а таксама — грамадскую думку ў пэўных рэгіёнах рэспублікі, напрыклад, у Чарнобыльскай зоне.

Пры падрыхтоўцы законаў неабходна не толькі юрыдычная граматнасць, але і сацыялагічная, г. зн. дасканалае веданне настрояў, сітуацыі, увогуле ўсіх працэсаў, якія адбываюцца рэальна.

— У час выбараў у мяне дома зазваніў тэлефон. Пыталіся, ці ведаю я, хто нашы дэпутаты, ці пайду галасаваць. Думаю, нашым чытачам цікава даведацца, якімі метадамі карыстаюцца сацыёлагі ў сваёй рабоце?

— Пры вывучэнні грамадскай думкі выкарыстоўваюцца звычайна анкетаванне і інтэрв'юіраванне. Апошняе, у прыватнасці, бывае некалькіх відаў: непасрэднае, пры дапамозе сродкаў масавай сувязі і масавай інфармацыі.

Усё залежыць ад таго, наколькі хутка трэба атрымаць вынікі і іх апрацаваць. Да тэлефоннага інтэрв'юіравання звяртаюцца ў экстранных выпадках, калі за тыдзень-два неабходна набыць пэўную інфармацыю і неяк на яе адрэагаваць. У перыяд перадвыбарнай барацьбы і працавала якраз група сацыёлагаў, якая выконвала заказы гарсавета, гаркома партыі.

У будучым любы кандыдат у дэпутаты зможа звярнуцца з заказам у нашу лабараторыю.

— Альберт Мікалаевіч, на вашых вачах праходзіць шмат сацыялагічных даследаванняў. Яны дапамагаюць не толькі разумець глыбінныя працэсы сённяшняга дня, але і, напэўна, прагназіраваць будучыя. Ваш асабісты прагноз: ці доўга яшчэ працягнецца сацыяльная, эканамічная нестабільнасць у нашым грамадстве?

— Лічу, што пры той палітыцы, якая праводзіцца, стан хаосу і няўстойлівасці будзе яшчэ больш нарастаць. Магу растлумачыць гэта толькі адным. Справа ў тым, што мы — занадта палітызаванае грамадства. У апошнія гады мы ператрэслі ўсе вярхі, усю надбудову, але эканамічныя тэндэнцыі засталіся ранейшыя. Нават нефармалы, яны ж таксама круцяцца ў галіне надбудовы, арыентуюцца толькі на палітыку. І ніхто не глядзіць на тое, што адбываецца ў базісе, у эканамічнай сферы. А базіс у нас поўнасцю разбураеццца. Планавая сістэма зруйнавана. Сістэма сувязей паміж прадпрыемствамі зруйнавана. Дысцыпліна працы апусцілася да самай нізкай адзнакі. Больш-менш актыўныя маладыя людзі бягуць з вытворчасці: у кааператывы ці ў гандаль. А калі так — матэрыяльная база наша ўсё больш будзе аслабляцца. Нельга забываць і пра ўцечку мазгоў. І чым далей так будзе працягвацца, тым менш будзе ў нас прадуктаў, больш пустымі будуць паліцы ў магазінах. А чым менш прадуктаў — тым больш абвостраца палітычныя страсці.

Думаю, што ў адміністрацыйнай сістэме быў свой пазітыўны бок, не выкарыстаны намі. Нельга сказаць, што яна поўнасцю нікчэмная, нікому не патрэбная. Яна і сёння ў нас у Беларусі спрабуе захаваць хоць якісьці парадак. А аб'ектыўныя працэсы ідуць так, што ўжо зрабіць гэта ранейшымі метадамі немагчыма.

Вельмі шмат у нашым цяперашнім жыцці нейкага стыхійнага элемента, які яўна не стабілізуе сітуацыю. Я б не хацеў быць злым прарокам, але калі і далей так справы пойдуць — баюся, пачне ліцца кроў. Нават цяжка прадказаць, хто супраць каго будзе ваяваць, але сутычкі могуць узнікнуць на самай рознай падставе: нацыянальнай, рэлігійнай, палітычнай.

У нас знікае з-пад ног глеба эканамічная — гэта трэба канстатаваць. І ні старая ўлада, ні новая пакуль нічога зрабіць не могуць, таму што рыначная сістэма гаспадарання яшчэ не створана, а планавая ўжо разбурана. Прыватнаўласніцкая, прадпрымальніцкая дзейнасць яшчэ не развіта, таму тавараў яна не дае. Той жа невялікі працэнт тавараў, які ў нас пакуль захаваўся, у вялікай колькасці трапляе ў рукі спекулянтаў. А гэта што? Гэта таксама эканоміка. Гэта новыя эканамічныя працэсы, якія мы тэарэтычна яшчэ не асэнсавалі. Ну як дзяржаўны тавар мог трапіць у рукі спекулянтаў? Тут таксама свае законы. Але ніхто іх не ведае і не вывучае. Няма ж такога «Капітала» для тлумачэння рыначных адносін ва ўмовах сацыялізму. Вы памятаеце, паводле Маркса, калі прыбытак рэзка павялічваецца, то павялічваецца і магчымасць злачыннасці.

Вось і атрымліваецца, першыя, хто ў нас карыстаецца рыначнымі адносінамі, — гэта тыя элементы, якія імкнуцца пераступіць закон, а не дзейнічаць у адпаведнасці з ім. Гэта разрывае наша грамадства і можа прывесці да сумных вынікаў.

Дабрабыту заходняга ўзору мы не дасягнём нават праз дзесяцігоддзі, таму што мы не навучыліся працаваць. Зараз жыццёвыя імкненні многіх зведзены да праблемы, як штосьці дастаць ці прадаць. Нацэленасці на працу, на вытворчасць няма.

— Што ж нам трэба рабіць?

— Могуць быць дзве пазіцыі. Радыкальная перабудовачная пазіцыя — гэта максімальна хутка ўсё ж уводзіць рыначныя адносіны, каб, нарэшце, пачала працаваць хай тая ж ценявая эканоміка, але — па гуманных законах. Калі б яна «выйшла на святло», яе можна было б кантраляваць: хто што вырабляе і каму прадае. Пакуль мы гэты працэс не кантралюем. Пакуль мы толькі ведаем, што фабрыка выпускае, а куды далей яе прадукцыя пайшла — не ведаем.

Вось стварылі «Белвест». Мы ўсе думалі: ай, як добра, будзем цяпер хадзіць у прыстойным абутку, а яго як не было, так і няма. Няма ўжо нават абутку мінскага «Промня». Куды ўсё падзелася? Загадка. А загадка чаму? Таму што мы не ведаем законаў вытворчасці і тавараабмену, які склаўся ў сённяшняй сітуацыі.

Трэба хіба радыкальна ісці да рынку, хіба спыняць усе гэтыя гульні і вяртацца да планавай сістэмы. Гэта і ёсць другая пазіцыя. Я, напрыклад, лічу, што магчымасці планавай сістэмы далёка не былі вычарпаны. І тая памылковая палітыка, якая вялася з часоў сталіншчыны і да брэжнеўшчыны, у якойсьці меры сказіла сутнасць сацыялізму. Справа ў тым, што сацыялізм у нас быў палітызаваны і мілітарызаваны. А гэта падрывала яго эканамічную аснову. Мы клапаціліся не пра свой дабрабыт, а толькі пра ваенную моц. Гэтым і вызначаўся наш светапогляд. Відавочна, што сацыялізм, які мы мелі, трэба было змяняць, але ці трэба яго было змяняць так радыкальна — яшчэ трэба падумаць.

— Але, бадай, мы ўжо так далёка зайшлі на новым шляху, што нельга вярнуцца назад, каб пачаць усё зноўку.

— Тады застаецца адно — рынак, прыватнае прадпрымальніцтва. І як мага больш хутка. Аднак наша беларускае кіраўніцтва досыць кансерватыўнае ў гэтым плане. Усё, зрэшты, можна растлумачыць. Як толькі ўсталююцца рыначныя адносіны, атрымае працяг прыватная ініцыятыва — адразу ўзнікне сітуацыя, пры якой кіруючая роля Кампартыі сама сабой адамрэ поўнасцю. І створацца новыя цывілізаваныя інстытуты кіравання.

Думаю, нам сёння трэба больш уважліва прыглядзецца да шырокага міжнароднага вопыту. Узяць тую ж Польшчу ў рэшце рэшт. Шокавая тэрапія дала свой вынік — сёння магазіны поўныя тавараў, армія скарацілася. Грамадства кансалідавалася. І краіна нармальна жыве пры малой арміі, якая існуе без палітаддзелаў. Нам таксама трэба хутчэй рухацца не да абмежаванага рынку, а менавіта да рынку, хаця гэта і звязана з балючымі працэсамі, як для кіраўнікоў, так і для радавых працаўнікоў. Неабходна ісці па напрамку, якім ішла сусветная цывілізацыя.

Аднак разлічваць на імклівае, тым больш раптоўнае павышэнне прадукцыйнасці працы не даводзіцца. Эканоміцы свае жаданні не навяжаш. Так што, улічваючы нашы шматгадовыя традыцыі, нашу псіхалогію, спадзявацца на цуд наіўна. І тым не менш сітуацыя на сённяшні дзень такая, што без паслядоўнага і як мага больш хуткага пераходу да рыначных адносін выбрацца з крызісу ўжо немагчыма, а часу на новы планавы эксперымент у нас проста няма. Застаецца ў гэтай крытычнай сітуацыі спадзявацца толькі на здаровы розум і народную кемлівасць, якая шмат разоў нас выручала.

**Гутарку вяла Г. ПШОНІК.**

# СТУДЫЁН

АКНО Ў ВЯЛІКІ СПОРТ

## Пераадолець бар'ер

**На юніёрскім чэмпіянаце свету па лёгкай атлетыцы, які праходзіў у Плоўдзіве, у складзе зборнай СССР выступаў студэнт геаграфічнага факультэта Віктар БУЛАТ.**

**Ён малады. Воля да перамогі, мэтанакіраванасць адкрылі хлопцу шлях у вялікі спорт. Віктар надта сціплы, таму пры размове са мной не сказаў пра вынік, які даў яму права на прысваенне звання майстра спорту міжнароднага класа. І ўсё ж на такія-сякія пытанні адказаў.**

**— Віктар, чэмпіянат свету для цябе — этап у жыцці?**

— Безумоўна. Перамога ў такім прэстыжным турніры — поспех. Спаборніцтвы сталі для мяне праверкай на сталасць, своеасаблівым бар'ерам на шляху да «дарослага» жыцця ў вялікім спорце.

**— Апошнім часам пазіцыі савецкіх штурхальнікаў ядра значна пахіснуліся. Вострую канкурэнцыю нашым хлопцам саставілі спартсмены з ФРГ і былой ГДР. А як праходзілі спаборніцтвы на гэтым чэмпіянаце?**

— Асаблівай барацьбы не было, але трэба аддаць належнае кітайцам. Адзін з іх заняў у Плоўдзіве другое месца.

**— Дзе ты зараз трэніруешся?**

— Пачынаў я ў Салігорску у ДЮСШ «Беларуськалій». Зараз займаюся ў Мінскай ШВСМ у Аляксандра Мікалаевіча Яфімава. Мой поспех — яго поспех. Я разумею, што трэнерская праца не лягчэйшая за нашу, таму аддаю належнае яго старанням і таленту.

**— Віктар, але ж асноўны твой занятак — вучоба...**

— Шчыра кажучы, яна ідзе не вельмі добра. Неабходна сумяшчаць трэніроўкі і заняткі ва універсітэце, а гэта не так лёгка. Не хачу скардзіцца, да нас, спартсменаў, выкладчыкі ставяцца не надта прыдзірліва, са скідкай, але ж мы самі разумеем, што на гэтым далёка не паедзеш. Нам у першую чаргу неабходны грунтоўныя веды па спецыяльнасці, тым больш ва ўмовах рынку, калі ў пошуках работы студэнт будзе кінуты амаль на волю лёсу — працаўладкоўвацца трэба самому.

**— Традыцыйнае пытанне: планы на будучае.**

— Зараз буду займацца толькі вучобай. Пастараюся ў бліжэйшы час здаць усе запазычанасці, а там і зборы не за гарамі.

А. СІВЫ,
студэнт факультэта журналістыкі.

ДРУГІ ТАЙМ

## Адступаць не прывучаны

У гэтым годзе першынство ВНУ рэспублікі па футболу пачалося як звычайна — у канцы красавіка. Але не ўсё ішло па звыкламу графіку: розыгрыш праводзіўся па новай сістэме. У ім удзельнічала як ніколі шмат каманд, якія былі разбіты на пяць падгруп: чатыры — па шэсць зборных і адна — пяць. Універсітэцкія спартсмены на лёгкую гульню не разлічвалі.

— І надзеі на выхад у фінал у нас было не надта многа, нягледзячы на тое, што састаў універсітэцкай зборнай нядрэнны, — успамінае старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту В. Д. Ліштван. — Па-першае, мы не мелі магчымасці падрыхтавацца да першынства як належыць. Заўсёды ўзнікалі праблемы з трэніроўкамі: дзе іх праводзіць? Свайго футбольнага поля мы не маем, таму заўсёды вымушаны прыладкоўвацца да чужога раскладу, а не займацца тады, калі зручна нам. Трэніраваліся на стадыёнах інстытутаў механізацыі сельскай гаспадаркі, фізічнай культуры і політэхнічнага. Такое непастаянства расхалоджвала людзей, зніжала рэзультатыўнасць падрыхтоўкі.

Памяншае нашы шансы на поспех і адсутнасць факультэта фізвыхавання, з-за чаго мы заўсёды адчуваем дэфіцыт прафесійных футбалістаў. Тым не менш, вынікі выступленняў нашай зборнай радуюць. Спадзяюся, у фінале мы таксама не падвядзём балельшчыкаў.

**Так, трэнер мае рацыю: рэзервы ў каманды ёсць. І «старыя», вопытныя ігракі: Жора Кастэнка (юрфак), Валера Блізнец (фізфак), Юра Шуканаў (геафак), Саша Даніленка (філфак), а таксама капітан каманды Алег Драздо (юрфак). І новае папаўненне: першакурснікі Віталь Казяк (факультэт радыёфізікі і электронікі), Артур Крыванос (фізфак). У іх руках вывесці каманду ў чэмпіёны ВНУ. А адступаць яны не прывучаны.**

ВЫ ЧУЛІ?

## «Фудакан» пачынае і... перамагае

У пачатку лістапада ў Мінскім палацы спорту прайшоў Міжнародны турнір па каратэ-до на прызы Рэспубліканскай Федэрацыі ўсходніх відаў фізічнай культуры. Памерацца сілай прыехалі спартсмены з В'етнама, Балгарыі, Грузіі, Туркменіі. Вынікі для беларускіх аматараў гэтага віду спорту даволі прыемныя. Нашы землякі былі мацнейшыя ў розных вагавых катэгорыях:

да 70 кг — Т. Майстрэнкаў з цэнтра «Фудакан»,

да 75 кг — У. Канькоў (Полацк),

да 80 кг — А. Папкоў (яшчэ раз «Фудакан»),

звыш 80 кг — І. Новікаў (зноў «Фудакан»).

А. СІВЫ.

ЗАПРАШАЕМ НА АЛІМП

## Вышэй - толькі неба

Дата нараджэння клуба — 1958 год.

Статус — старэйшае спартыўна-турысцкае і альпінісцкае нефармальнае аб'яднанне рэспублікі.

Геаграфія вандровак — тундра, тайга, пустыня, горы.

Калі задацца мэтай і паспрабаваць адзначыць на карце месцы, дзе ступала нага членаў турклуба БДУ, застанецца мала «белых» плям. Мінулы год не быў менш багатым на «адкрыцці» новых земляў. Турысты-альпіністы ўдзельнічалі ў паходах па Літве, Латвіі, адчулі «гасціннасць» Каракумаў, пераканаліся ў казачнай прыгажосці Саян і неабсяжнасці Паўночнага Ледавітага акіяна, неаднойчы сустракаліся з Капетдагам, Гаверлай, Хібінамі, а таксама асвойвалі малаходжаныя турыстамі-воднікамі і мясцовымі жыхарамі рэкі Карэліі і Алтая. Найвышэйшае альпінісцкае дасягненне — пік Каржанеўскі.

Прыйсці ў клуб ніколі не позна, але яго прэзідэнт — майстар спорту па турызму, прафесар Анатоль Сямёнавіч Фядэнка раіць пачаць заняткі не пазней лістапада, каб да летняга сезону — разгару падарожжаў — атрымаць добрую фізічную і тактычную падрыхтоўку. Пешыя, водныя, лыжныя, горныя і велапаходы, спаборніцтвы па бегу, спартыўнаму арыентаванню і іншых прыкладных відах спорту дапамогуць у гэтым.

Клуб прымае пад свой дах усіх жадаючых, незалежна ад узросту, месца работы ці вучобы, ступені фізічнай падрыхтаванасці. Нароўні з савецкімі студэнтамі могуць атрымаць пасведчанні інструктараў па турызму, а таксама пуцёўкі ў альпінісцкія лагеры і на горналыжныя базы і замежныя навучэнцы.

З. МІХНЕВІЧ.



Імгненні барацьбы.

Фота С. ГРЫЦА.



НА СПАРТЫЎНЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

### ШАХМАТЫ І ЖАНЧЫНЫ

А чаму б не? Ці глядзецца прадстаўніцы «слабага полу» будуць за шахматнай дошкай горш за мужчын? Магчыма, горш згуляюць?

Пераканацца ў адваротным вам дапаможа паведамленне аб першым чэмпіянаце шахматных клубаў СССР, які адбыўся ў Смаленску (значыць, ёсць шахматысткі!). Сярод 22 каманд была і наша. За зборную рэспубліканскага Палаца шахмат і шашак гулялі міжнародны майстар, студэнтка БДУ імя У. І. Леніна Алёна Заяц і кандыдаты ў майстры Вольга Ламакіна і Алёна Герасімовіч. 16 ачкоў з 27 набрала ў 9 турах наша каманда і заняла чацвёртае месца. Асаблівы поспех — у Алёны Заяц. З 6,5 ачкамі з 9 на сваёй дошцы яна апынулася на першым месцы.

### А ЛЯ АМЕРЫКА?

Пра гэты від спорту раней мы чулі ў кантэксце з чым-небудзь «іхнім». Але часы мяняюцца: бейсбол стаў і «нашым». Нават на гульнях у Барселоне мы будзем змагацца за права называцца алімпійскімі чэмпіёнамі ў гэтым відзе.

Першая ў рэспубліцы зборная па бейсболу пачала сваю гісторыю не так даўно. «Беларускія зубры» — так называецца каманда Беларускага дзяржаўнага інстытута фізічнай культуры, якую трэніруе выпускнік гэтага ж інстытута Дзмітрый Сагальчык. Бейсбалісты паспелі ўжо заваяваць права на выступленне ў Першай лізе чэмпіянату СССР у 1991 годзе.

### НАЗАД ДАРОГІ НЯМА...

З дня правядзення Алімпійскіх гульняў 1984 года прайшло нямала часу. Але ён не сцёр з нашай памяці бліскучае выступленне танцавальнай пары фігурыстаў з Англіі (яны сталі алімпійскімі чэмпіёнамі) Джэйн Торвіл і Крыстофер Дзін. На жаль, гэта наша сустрэча з майстрамі была, відаць, апошняй. Як паведаміла агенцтва Франц Прэс, спартсмены не збіраюцца вяртацца да ўдзелу ў афіцыйных спаборніцтвах па фігурнаму катанню.

— Мы нават не марым аб такім вяртанні, — заявіў Дзін. — Мы ж заваявалі на лёдзе ўсё, што толькі можна.

### АДРАДЗІЦЬ ПРЭСТЫЖ МОЖНА

Сёння надзвычай востра стаіць пытанне: якое будучае чакае лёгкаатлетычную «гаспадарку» краіны? Удзельнікік восеньскага пленума Федэрацыі лёгкай атлетыкі выказалі заклапочанасць рэзкім падзеннем масавасці ўсіх відаў спаборніцтваў. Калі раней розныя віды прабегаў, кросаў збіралі сотні тысяч юнакоў і дзяўчат, то зараз такую колькасць удзельнікаў можна ўбачыць бадай што толькі на Маскоўскім міжнародным марафоне міру.

А ўсё пачынаецца... з дзяцінства. Адышла ў мінулае жорсткая канкурэнцыя пры паступленні ў дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы, якія спецыялізуюцца па гэтаму віду. А з іх выходзіць маладое пакаленне спартсменаў. Зараз тут рады кожнаму дзіцяці, нягледзячы на яго здольнасці.

Тым не менш, новы прэзідэнт Федэрацыі лёгкай атлетыкі Ігар Тэр-Аванесян не страчвае аптымізму. Ён перакананы, што прэстыж «каралевы спорту» абавязкова падымецца. Трэба толькі пастарацца.

ВЕДАЙ НАШЫХ

## НА ШЛЯХУ ДА БАРСЕЛОНЫ

ДЛЯ СТУДЭНТА юрыдычнага факультэта Сяргея Дзямяшкевіча шлях гэты доўгі і нялёгкі. Пачаўся ён з трэніровак, працягваецца саюзнымі і сусветнымі першынствамі. Графік іх быў настолькі шчыльным, што Сяргею давялося на час развітацца з вучобай і ўзяць акадэмічны адпачынак. Праўда, спраў столькі, што хлопец толькі паспявае на дзень-другі заглянуць дамоў, каб памяняць рэчы. І зноў — у дарогу.

Апошняя паездка аказалася для спартсмена надзвычай удалай.

«Вынік 38-га чэмпіянату свету па класічнай барацьбе ў Рыме ўражвае: савецкія спартсмены маюць у актыве 6 залатых, 3 сярэбраных і 1 бронзавую ўзнагароды», — неўзабаве пасля спаборніцтваў паведамляла газета «Советский спорт». «Залатым» аказаўся і наш Сяргей Дзямяшкевіч.

Сам Сяргей наўрад ці чакаў такога поспеху — падгрупа, у якой ён выступаў, была адной з самых цяжкіх. За плячыма ў яго сапернікаў — вопыт, перамогі, узнагароды. Спартсмен рыхтаваў сябе да нялёгкай барацьбы. І вось вынік — у вагавай катэгорыі да 100 кг яму не было роўных.

Асабліва бліскучай і нечаканай як для балельшчыкаў, так і для самога барца, была фінальная схватка з венграм Шандорам Мазорам. Вынік ашаламляльны: пасля двух кідкоў — прагібаў з задняга захвату — Сяргей не пакінуў саперніку ніякай надзеі на перамогу. 8:0 — так завяршыўся паядынак. Дзякуючы яму, барэц праклаў сабе шлях на Алімпійскія гульні ў Барселону.

— Вельмі спадзяваўся на яго, — з гонарам за свайго падапечнага гаворыць старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту В. А. Рудзянкоў, які трэніруе С. Дзямяшкевіча. — У тым, што Сяргей вернецца з Рыма з унагародай, ні на хвіліну не сумняваўся. Гэта надзвычай таленавіты барэц. Нягледзячы на тое, што канкурэнты ў яго былі моцныя, ён ужо з першых хвілін паказаў, што ўступаць перамогу нікому не збіраецца. Калі не здарыцца якіх-небудзь непрыемных нечаканасцей, мы абавязкова ўбачым нашага спартсмена на барцоўскім памосце ў Барселоне: ён — прэтэндэнт нумар адзін.

З. МІХНЕВІЧ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

22 лістапада

Заказ 2029.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75. ТЭЛЕФОН 20-68-37.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.